ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1982
21
СТУДЗЕНЯ
ЧАЦВЕР
№ 3 [1341]
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

# Узнагароды радуюць і натхняюць

## УКАЗ
## ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні Беларускага дзяржаўнага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэта імя У. І. Леніна Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР**

За поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і вялікі ўклад у развіццё навукі і культуры ўзнагародзіць Беларускі дзяржаўны ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга універсітэт імя У. І. Леніна Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
І. ПАЛЯКОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

13 студзеня 1982 года.
г. Мінск.



Уручэнне Ганаровай граматы Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

## УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

**Аб узнагароджанні Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР работнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна**

За поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, развіцці навукі і культуры ўзнагародзіць:

**ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**Баркоўскага** Леаніда Мацвеевіча — дацэнта.

**Вечара** Аліма Аляксандравіча — загадчыка кафедры.

**Волка** Аляксея Арсеньевіча —дэкана факультэта.

**Галаўко** Анатоля Аляксандравіча — загадчыка кафедры.

**Дземчука** Міхаіла Іванавіча— загадчыка лабараторыі.

**Дулава** Андрэя Васільевіча —загадчыка кафедры.

**Елісеева** Міхаіла Герасімавіча — сакратара парткома.

**Жбанкову** Інесу Іванаўну — загадчыцу кафедры.

**Жмайдзяка** Расціслава Афанасьевіча — намесніка дэкана факультэта.

**Жмуроўскага** Дзмітрыя Пятровіча — прафесара.

**Ісачанкаву** Ларысу Арцёмаўну — дацэнта, намесніка старшыні мясцкома.

**Камяка** Анатоля Іванавіча — загадчыка кафедры.

**Карзюка** Віктара Іванавіча — выконваючага абавязкі дэкана факультэта.

**Лузгіну** Святлану Васільеўну —загадчыцу кафедры.

**Мядзведзева** Генадзя Аляксеевіча — загадчыка кафедры.

**Мельцэра** Давіда Барысавіча — прафесара.

**Малочку** Анатоля Дзянісавіча — дырэктара інстытута павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў грамадскіх навук.

**Аўсянку** Леаніда Міхайлавіча —дацэнта.

**Салава** Пятра Лаўрэнцьевіча —намесніка сакратара парткома.

**Сікорскую** Надзею Паўлаўну —дацэнта.

**Сіліна** Уладзіміра Іванавіча —прарэктара.

**Сцёпіна** Вячаслава Сямёнавіча — загадчыка кафедры.

**Цікоцкага** Міхаіла Яўгенавіча — загадчыка кафедры.

**Юхо** Іосіфа Аляксандравіча —намесніка дэкана факультэта.

**Ямнага** Віталя Яўгенавіча — дацэнта.

**ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**Алейнікаву** Антаніну Фёдараўну — загадчыцу кабінета.

**Алькіну** Ніну Фёдараўну — — старшага майстра друкарні.

**Анохіну** Веру Сцяпанаўну — выконваючую абавязкі загадчыка кафедры.

**Барабанава** Віктара Паўлавіча — намесніка начальніка кафедры.

**Барздова** Міхаіла Лявонцьевіча — начальніка аддзела кадраў.

**Булацкага** Рыгора Васільевіча — загадчыка кафедры.

**Грыгор'ева** Васіля Сяргеевіча — дырэктара выдавецтва.

**Дразда** Мікалая Мінавіча — старшыню прафсаюзнага камітэта.

**Клімовіч** Вольгу Сіланцьеўну —загадчыцу склада.

**Марчанку** Івана Васільевіча —дацэнта.

**Паўловіч** Людмілу Андрэеўну — дацэнта.

**Патрына** Аляксея Аляксеевіча — дацэнта.

**Піскунова** Ягора Андрэевіча — старшага лабаранта.

**Пыжкова** Васіля Андрэевіча —прафесара.

**Раманава** Мікалая Мікалаевіча — вадзіцеля аўтамабіля.

**Рухлю** Аляксандра Мікалаевіча — сакратара камітэта камсамола.

**Слуку** Алега Георгіевіча — загадчыка падрыхтоўчага аддзялення.

**Стрэльчанку** Уладзіміра Мікітавіча — дэкана факультэта.

**Тарасевіча** Уладзіміра Іванавіча — начальніка аддзела.

**Чупрыгіна** Алега Аляксандравіча — намесніка дэкана факультэта.

**Шпілеўскага** Эдуарда Міхайлавіча — дэкана факультэта.

**Юзефовіча** Міхаіла Іванавіча —загадчыка вучэбна-вытворчых майстэрань.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
І. ПАЛЯКОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

13 студзеня 1982 года.
г. Мінск.

## Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

**Аб прысваенні ганаровых званняў Беларускай ССР работнікам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна**

За поспехі ў развіцці вышэйшай адукацыі, навукі, тэхнікі і культуры, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці прысвоіць ганаровыя званні:

**ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА НАВУКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**Габасаву** Рафаілу — загадчыку кафедры.

**Цішчанку** Івану Рыгоравічу — загадчыку кафедры.

**Шубе** Паўлу Паўлавічу — загадчыку кафедры.

**ЗАСЛУЖАНАГА ДЗЕЯЧА НАВУКІ І ТЭХНІКІ БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**Гольцаву** Усеваладу Паўлінавічу — загадчыку кафедры.

**Шушкевічу** Станіславу Станіслававічу — загадчыку кафедры.

**ЗАСЛУЖАНАГА РАБОТНІКА ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**Дронюю** Паўлу Пятровічу — загадчыку кафедры.

**Зяцькову** Івану Паўлавічу — прарэктару.

**Казловай** Вользе Васільеўне — загадчыцы кафедры.

**Марціновіч** Ізабеле Іванаўне — прафесару.

**Рагоўскаму** Івану Трыфанавічу — дэкану факультэта.

**Цікаваму** Вадзіму Фёдаравічу — дэкану факультэта.

**Трухнову** Рыгору Маркавічу — прафесару.

**Царук** Іраідзе Осіпаўне — дэкану факультэта.

**Шуканаву** Адаму Сямёнавічу — дэкану факультэта.

**Янчанку** Сцяпану Яфімавічу — загадчыку кафедры.

**ЗАСЛУЖАНАГА НАСТАЎНІКА БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**Баранавай** Марыі Парфір'еўне — дацэнту.

**ЗАСЛУЖАНАГА РАБОТНІКА КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАЙ ССР**

**АраХоўскай** Іраідзе Уладзіміраўне — дырэктару бібліятэкі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
І. ПАЛЯКОЎ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР
Л. ЧАГІНА.

13 студзеня 1982 года. г. Мінск.

# Прывітальная тэлеграма

**Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР горача віншуе калектыў прафесараў, выкладчыкаў, студэнтаў, аспірантаў і супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта з шасцідзесяцігадовым юбілеем. Дзякуючы нястомнаму клопату Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада Беларускі дзяржаўны універсітэт пастаянна развіваецца і ўмацоўваецца, уносячы свой значны ўклад у навукова-тэхнічны прагрэс нашага грамадства, у яго шматнацыянальную сацыялістычную культуру. Калектыў прафесараў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта сваімі навуковымі даследаваннямі ўпісаў нямала цудоўных старонак у гісторыю айчыннай і сусветнай навукі. Вопыт работы, дасягненні Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў галіне ідэйна-выхаваўчай, вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай дзейнасці дазваляюць па праву назваць яго адным з вядучых універсітэтаў нашай краіны.**

**Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР выказвае ўпэўненасць у тым, што слаўны калектыў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна разам з усім савецкім народам унясе дастойны ўклад у ажыццяўленне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС, дасягне новых поспехаў у навуцы, ва ўдасканаленні вучэбнага працэсу, у падрыхтоўцы і камуністычным выхаванні спецыялістаў, бязмежна адданых нашай Радзіме і справе камунізму.**

**В. ЕЛЮЦІН,**
**міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.**

## У АДРАС БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПАСТУПІЛІ ПРЫВІТАЛЬНЫЯ ТЭЛЕГРАМЫ АД:

**А. А. Лагунова**, рэктара Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта;

**Т. П. Янушкоўскай**, старшыні ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў;

**В. Б. Аляскоўскага**, рэктара Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта;

**Ю. А. Жданава**, рэктара Растоўскага дзяржаўнага універсітэта;

**С. А. Амбарцумяна**, рэктара Ерэванскага дзяржаўнага універсітэта;

**І. Я. Тарапава**, рэктара Харкаўскага дзяржаўнага універсітэта;

**Б. Я. Мельніка**, рэктара Кішынёўскага дзяржаўнага універсітэта;

**А. В. Коопа**, рэктара Тартускага дзяржаўнага універсітэта;

**А. А. Тоўсціка**, старшыні праўлення Саюза журналістаў БССР;

**Б. Б. Бойкі**, дырэктара інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН БССР;

**прафесара Болька**, рэктара Йенскага універсітэта імя Ф. Шылера (ГДР);

**А. Вазьняка**, Генеральнага консула ПНР у Мінску;

**С. Бернатэка**, генеральнага консула ГДР у Мінску;

Прывітальныя тэлеграмы таксама паступілі ад іншых кіраўнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, навуковых цэнтраў, калектываў працоўных, выпускнікоў універсітэта.

# РОДНЫ СЭРЦУ

ЯШЧЭ ДЫМІЛІСЯ РУІНЫ,
ЯШЧЭ ЦЯМРЭЎ РАЗРУХІ ЦЕНЬ,
ДЫ НАД ПРАСТОРАМІ КРАІНЫ
УЖО ЎСТАВАЎ ВЫСОКІ ДЗЕНЬ.

І ЧУЎСЯ ГУЛ СТАНКОЎ ФАБРЫЧНЫХ
І МАЛАТОЎ КАВАЛЬСКІХ ЗВОН —
ДА ТВОРЧАЙ ПРАЦЫ ЗВАЎ КАСТРЫЧНІК,
ДА ШЧАСЦЯ КЛІКАЎ БРАЦЬ РАЗГОН.

ТАДЫ І БЫЎ УЛАСНАРУЧНА
ПАДПІСАН ЛЕНІНЫМ ДЭКРЭТ:
АДКРЫЦЬ У МІНСКУ БЕЛАРУСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ.
У КРАІ ТЫМ, ДЗЕ НА ПАЦЁМКІ
НАРОД, АДВЕКУ ЦЁМНЫ САМ,
ГЛЯДЗЕЎ З ЦАРКВЫ АБО З КАРЧОМКІ,—
АДКРЫЦЬ НАВУКІ СВЕТЛЫ ХРАМ!

І Ў НЕЗАБЫЎНЫ ДЗЕНЬ АСЕННІ,
ШТО ЗЗЯЎ, ЯК РАНІЦА ВЯСНЫ,
У ХРАМЕ Ў ТЫМ ЗА ПАРТЫ СЕЛІ
ПРАЦОЎНЫХ ДОЧКІ І СЫНЫ.

ДЗЯДОЎ, БАЦЬКОЎ НАДЗЕЯ-МАРА
ДЛЯ ІХ ПАЎСТАЛА НАЯВУ...
АД ТОЙ ПАРЫ ПРАЙШОЎ НЯМАЛА
ДАРОГАЙ СЛАВЫ БДУ.

І НЕЗДАРМА ТАК СЁННЯ ГОРДА
ЁН НОСІЦЬ ЛЕНІНА ІМЯ,
І НА СЦЯГУ ЯГОНЫМ ОРДЭН
ЗІХЦІЦЬ ТАКСАМА НЕЗДАРМА!

КАБ РОДНЫ КРАЙ ПАДНЯЦЬ І ЎЗВЫСІЦЬ
ДА ЗОР КАМУНЫ ЗАЛАТЫХ,
ТЫ ДАЎ ЯМУ ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ
СПЕЦЫЯЛІСТАЎ МАЛАДЫХ!

КУДЫ, ЯКОЙ ДАРОГАЙ КРАЮ
Я Б НІ ПАЕХАЎ, НІ ПАЙШОЎ,—
АБАВЯЗКОВА НАПАТКАЮ
ТВАІХ БЫЛЫХ ВЫПУСКНІКОЎ.

І ЛІЧЫЦЬ КОЖНЫ З ІХ ЗА ГОНАР,
ШТО БЫЎ СТУДЭНТАМ БДУ,
ШТО ЛЯ ТВАІХ ІСКРЫСТЫХ ГОРНАЎ
ВУЧЫЎСЯ ПРАЎДЗЕ І ДАБРУ...

О СВЕТЛЫ ЧАС ЗІХЦЕННЯ ВОКАН
У ПРОМНЯХ РАНІШНЯЙ КРАСЫ —
КАЛІ З ЮНАЦТВАМ ЯСНАВОКІМ
ІРВЕЦЦА СОНЦА Ў КАРПУСЫ!

О ГОМАН ТЫСЯЧАГАЛОСЫ
ЗНАЁМАЙ МІЛАЙ МІТУСНІ!
О ТАЯМНІЧЫЯ ДЗІВОСЫ
ЛАБАРАТОРНАЙ ЦІШЫНІ!

О РОДНЫ СЭРЦУ БЕЛАРУСКІ
ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ —
НІХТО ДУШОЙ НЕ ЗАСКАРУЗНЕ,
ХТО Ў ТВОЙ ПАВЕРЫЎ ЗАПАВЕТ!

РАСЦІ Ж І СЛАЎСЯ ГОД АД ГОДУ,
ПРАЦОЎНЫ ГОНАР БЕРАЖЫ,
СЛУЖЫ РАДЗІМЕ І НАРОДУ,
ІДЭЯМ ЛЕНІНА СЛУЖЫ!

**Ніл ГІЛЕВІЧ.**

# ПА-ЛЕНІНСКУ ЖЫЦЬ,

УРАЧЫСТАЯ зала Дзяржаўнага ордэна Леніна Вялікага тэатра оперы і балета БССР нагадвае вялікую універсітэцкую аўдыторыю, у якой сканцэтраваўся час, сабраўшы разам выпускнікоў усіх шасці дзесяцігоддзяў, сімвалізуючы іх дасягненнямі слаўны шлях Беларускага універсітэта. Былыя і цяперашнія студэнты і выкладчыкі сабраліся тут, каб адзначыць 60-годдзе БДУ імя У. І. Леніна.

Раздзяліць урачыстасць з калектывам старэйшай навучальнай установы рэспублікі прыйшлі намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР І. Я. Палякоў, другі сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі У. І. Бровікаў, сакратар Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі А. Т. Кузьмін, першы сакратар Мінскага абкома Кампартыі Беларусі У. А. Мікуліч, намеснік Старшыні Савета Міністраў Беларускай ССР Н. Л. Сняжкова, першы сакратар Мінскага гарадскога камітэта партыі Г. Г. Барташэвіч, а таксама міністры, адказныя работнікі партыйных і савецкіх органаў, грамадскіх арганізацый, рэктары ВНУ рэспублікі, кіраўнікі навуковых устаноў. Для большасці ганаровых гасцей наш БДУ — альма-матэр.

Павіншаваць калегу прыбылі дэлегаты старэйшых універсітэтаў краіны. Іх прадстаўляюць Э. Д. Яршоў — прафесар, дэкан Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта, С. А. Малінін — прафесар, першы прарэктар Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта, М. У. Белы — прафесар, член-карэспандэнт АН УССР, рэктар Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта, Т. А. Сарымсакаў—акадэмік АН Узбекскай ССР, рэктар Ташкенцкага дзяржаўнага універсітэта, І. П. Кубілюс — акадэмік АН Літоўскай ССР, рэктар Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта, В. О. Мілер — член-карэспандэнт АН Латвійскай ССР, рэктар Латвійскага дзяржаўнага універсітэта.

На сцэне — барэльеф У. І. Леніна, палымяны факел ведаў — эмблема 60-годдзя БДУ, жывыя кветкі.

— Паважаныя госці, таварышы! — адкрывае ўрачысты сход сакратар парткома універсітэта М. Г. Елісееў. — Мы сабраліся з вамі ў гэтай светлай зале з нагоды знамянальнай і ўрачыстай. Споўнілася 60 гадоў Беларускаму ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнаму універсітэту імя У. І. Леніна.

Белдзяржуніверсітэт — дзіця Вялікага Кастрычніка. Стварэнне універсітэта з'явілася ажыццяўленнем ленінскай нацыянальнай палітыкі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы. Універсітэт адыграў значную ролю ў развіцці сацыялістычнай беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, навукі і культуры.

Дзякуючы пастаяннаму бацькоўскаму клопату Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада Беларускі дзяржаўны універсітэт за прайшоўшыя гады ператварыўся ў адну з буйнейшых ВНУ, стаў сапраўднай кузняй высокакваліфікаваных кадраў.




Адгучалі Дзяржаўныя гімны Савецкага Саюза і Беларускай ССР. І вось ужо над радамі прысутных праплыў чырвоны аксаміт універсітэцкага сцяга, які шчыра вітаюць гаспадары і госці свята. Сцяганосец — Герой Савецкага Саюза, старшы выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі М. Я. Зайцаў. Яго асістэнты — загадчык кафедры арганічнай хіміі, заслужаны дзеяч навукі БССР, член-карэспандэнт АН БССР І. Р. Цішчанка, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі, загадчык аддзела сродкаў аўтаматызацыі навуковых даследаванняў, кандыдат фізіка-матэматычных навук М. І. Дзямчук, удзельнік пяці працоўных семестраў, кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга П. Г. Аксючыц.

Слова бярэ дэкан юрыдычнага факультэта, прафесар, кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэна Айчыннай вайны другой ступені В. Ф. Чыгір, які ўносіць прапа-



# УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ ВУЧОНАГА САВЕТА

З ГЛЫБОКАЙ АСЭНСАВАНАСЦЮ сваёй высакароднай місіі ў развіцці эканомікі і культуры краіны, з пачуццём высокай адказнасці перад Радзімай, рашучасцю аддаць свае веды і энергію савецкаму народу, вялікім ідэалам камунізму прыйшлі раніцой 14 студзеня прафесары і выкладчыкі ў актавую залу галоўнага корпуса БДУ на ўрачыстае пасяджэнне вучонага савета, прысвечанае 60-годдзю універсітэта.

У зале сабраліся прадстаўнікі партыйных, савецкіх, камсамольскіх арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў і навуковых цэнтраў рэспублікі і краіны. Прыбылі прадстаўнікі універсітэтаў Масквы, Ленінграда і іншых гарадоў краіны, замежныя госці.

Урачыстае пасяджэнне вучонага савета адкрыў рэктар Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна акадэмік АН БССР У. А. Белы. Ён цёпла прывітаў усіх прысутных. Ад імя членаў вучонага савета і гасцей ускладаюцца кветкі да помніка заснавальніка Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна.

Слова прадастаўляецца прарэктару па вучэбнай рабоце прафесару У. Р. Івашыну, які выступіў са змястоўным дакладам аб гісторыі стварэння універсітэта, яго сённяшніх дасягненнях і поспехах, перспектывах далейшага развіцця.

Потым прадстаўнікі партыйных, савецкіх, камсамольскіх органаў, грамадскіх арганізацый, вышэйшых навучальных устаноў і навуковых цэнтраў рэспублікі і краіны, выпускнікі сардэчна прывіталі ўсіх прысутных і універсітэт, выказалі пажаданні новых поспехаў у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў і навуковай дзейнасці, уручылі памятныя адрасы і сувеніры.

**Наш кар.**

# ПРАЦАВАЦЬ І ВУЧЫЦЦА

нову выбраць ганаровы прэзідыум урачыстага сходу ў саставе Палітбюро ЦК КПСС на чале з Генеральным сакратаром ЦК КПСС, Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварышам Л. І. Брэжневым. Бурныя апладысменты прысутных сведчаць аб аднадушнай падтрымцы прапановы.

Ад імя ЦК КПБ і ўрада рэспублікі калектыў БДУ сардэчна вітае Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Я. Палякоў. Ён уручае універсітэту Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета БССР, якой калектыў удастоены за поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і вялікі ўклад у развіццё навукі і культуры. Узнагароду прымаюць рэктар БДУ імя У. І. Леніна, акадэмік АН БССР У. А. Белы, сакратар парткома дацэнт М. Г. Елісееў, старшыня мясцкома дацэнт Э. В. Шастаковіч, старшыня прафкома М. М. Дрозд.

Выступаючы са словамі падзякі, рэктар Белдзяржуніверсітэта акадэмік АН БССР У. А. Белы эдзначыў, што сам факт стварэння Белдзяржунівертэта з'явіўся вынікам тытанічнай і плённай рэвалюцыйна - аднаўленчай дзейнасці Камуністычнай партыі, тых гіганцкіх сацыяльных зрухаў, якія адбыліся ў нашай краіне пасля перамогі Вялікага Кастрычніка.

Мы добра памятаем тых, хто, выконваючы ўказанні Камуністычнай партыі, праявіў выключную ініцыятыву і настойлівасць у стварэнні Беларускага універсітэта. Гэта выдатныя партыйныя, дзяржаўныя дзеячы і вучоныя, і перш за ўсё А. Ф. Мяснікоў, А. Р. Чарвякоў, М. М. Пакроўскі, Я. Ф. Карскі, В. П. Волгін, К. А. Ціміразеў, Д. М. Пранішнікаў, У. І. Пічэта. Вялікую дапамогу ў стварэнні універсітэта аказалі Маскоўскі, Петраградскі і Кіеўскі універсітэты, Расійская акадэмія навук, Цэнтральная кніжная палата.

30 кастрычніка 1921 года 14 прафесараў і 59 выкладчыкаў пачалі навучаць 1390 студэнтаў трох факультэтаў — рабочага, грамадскіх навук і медыцынскага. Так пачаў работу наш універсітэт. І вось ужо на працягу 60 гадоў Беларускі універсітэт з году ў год нарошчвае свой уклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў, у развіццё навукі, культуры, у паскарэнне навукова-тэхнічнага прагрэсу. Уся яго дзейнасць даказвае прадбачлівасць задумкі, дзякуючы якой станаўленне вышэйшай адукацыі і навукі ў Беларусі было пачата з арганізацыі іменна універсітэта. «Бо ў сучасным свеце, — сказаў таварыш Л. І. Брэжнеў, — дзейнасць універсітэтаў становіцца ўсё больш значнай у эканамічным і сацыяльным жыцці кожнай краіны. Яны здзяйсняюць падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў для усіх галін матэрыяльнай вытворчасці і духоўнага жыцця, уносяць важкі ўклад у развіццё навукова-тэхнічнай рэвалюцыі».

Як кожная маці радуецца дзецям, знайшоўшым павагу людзей, так і наш універсітэт ганарыцца сваімі выпускнікамі, якія працуюць у самых розных галінах навукі, культуры, асветы, народнай гаспадаркі. Яны заўсёды былі, ёсць і будуць на пярэднім краі будаўнікоў новага жыцця, дапамагаючы партыі ў будаўніцтве светлага камуністычнага заўтра.

XXVI з'езд КПСС, які распрацаваў грандыёзныя планы камуністычнага будаўніцтва, паставіў перад вышэйшай школай вялікія і адказныя задачы па падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі і далейшага развіцця навукі.

Калектыў універсітэта, які назапасіў велізарны вопыт і слаўныя традыцыі, мабілізаваны на выкананне гэтых задач. Сёння на 105 кафедрах БДУ працуюць 145 дактароў навук, прафесараў, у тым ліку 47 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН СССР і АН БССР, звыш 900 дацэнтаў і кандыдатаў навук, 40 лаўрэатаў Ленінскай і Дзяржаўных прэмій, прэмій Ленінскага камсамола, дзесяткі заслужаных дзеячаў навукі, вышэйшай школы, навукі і тэхнікі. Такому навукова-педагагічнаму атраду па сіле самыя складаныя задачы.

Вучэбныя планы ва універсітэце складзены такім чынам, каб забяспечыць глыбокае авалоданне фундаментальнымі ведамі на ўзроўні самых сучасных дасягненняў навукі, развіць творчы падыход у рашэнні ўсіх задач, якія прапаноўвае жыццё, даць кожнаму студэнту шырокую марксісцка-ленінскую падрыхтоўку.

Нашы прафесары, дацэнты, выкладчыкі ўзялі на ўзбраенне праблемнае чытанне лекцый, выкарыстоўваюць у працэсе лабараторных практыкумаў сучасныя метады эксперыментавання, практыкуюць правядзенне дзелавых гульняў і мадэліраванне вытворчых становішчаў. Значная частка курсавых і дыпломных работ зараз выконваецца па рэальнай тэматыцы. Аднак ужо ў бліжэйшым будучым адной з асноўных нашых функцый стане навучанне студэнтаў уменню вучыцца. Таму выбар метадаў навучання трэба будзе здзяйсняць у разліку на ўзрастанне самастойнасці і знаходлівасці студэнтаў у той ці іншай вучэбнай сітуацыі. Крокам да гэтага ў некаторай ступені з'яўляецца ўсё больш шырокае прымяненне тэхнічных сродкаў навучання, у чым наш універсітэт па шматлікіх напрамках з'яўляецца піянерам.

Рэктарат, партыйная арганізацыя, дэканаты факультэтаў цвёрда прытрымліваюцца таго пункту гледжання, што выхаванне студэнцкай моладзі нельга разглядаць як які-небудзь дадатак да вучэбных планаў і праграм. Наадварот, у ім, як у фокусе, сума ведаў, атрыманых у працэсе навучання, павінна ўвасабляцца ў марксісцка-ленінскі светапогляд, у асабістыя перакананні маладых спецыялістаў. Выхоўваць, навучаючы, і навучаць, выхоўваючы, — такі наш дэвіз.

Напярэдадні свайго 60-годдзя калектыў універсітэта правёў агляд вынікаў работы за апошнія гады, якія былі выкладзены на пяці навуковых канферэнцыях.

Вельмі радасна, што ў юбілейных навуковых і навукова-метадычных канферэнцыях універсітэта кіравалі секцыямі і выступалі з дакладамі вядучыя вучоныя АН БССР, лаўрэаты Ленінскіх прэмій — прэзідэнт АН БССР акадэмік М. А. Барысевіч, акадэмікі АН БССР У. П. Платонаў, Р. І. Салаухін, Герой Сацыялістычнай Працы акадэмік АН БССР Ф. І. Фёдараў, акадэмікі АН БССР Л. В. Хатылёва, П. А. Дарожкін, Л. М. Сушчэня і многія іншыя.

Сёння наш універсітэт з'яўляецца адным з буйнейшых навуковых цэнтраў рэспублікі. Тут працуе амаль кожны пяты доктар навук Беларусі. Гэта ў пэўным сэнсе сведчыць аб ролі універсітэта і яго адказнасці за навуковы патэнцыял рэспублікі.

Ва універсітэце, дзе побач з фізікам вучыцца і працуе біёлаг, побач з хімікам — матэматык, філолаг або эканаміст, ёсць вельмі добрыя ўмовы для паспяховага развіцця перш за ўсё фундаментальных даследаванняў, якія аказваюць велізарны і непасрэдны ўплыў на навукова-тэхнічны і сацыяльны прагрэс.

Нашы вучоныя-грамадазнаў-

(Заканчэнне на 4-й стар.).




# Нас віншуюць

**Са святкаваннем 60-годдзя універсітэт павіншавалі і ўручылі прывітальныя адрасы:**

**Мінскі АК КПБ;**
**Мінскі ГК КПБ і выканком Савета народных дэпутатаў;**
**Калегія Міністэрства меліярацыі воднай гаспадаркі БССР;**
**Навукова-вытворчае аб'яднанне парашковай металургіі;**
**Маскоўскі райком КПБ і выканком Савета народных дэпутатаў;**
**Цэнтральны батанічны сад;**
**Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут;**
**Віцебскае аддзяленне Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў АН БССР;**
**Беларуская дзяржаўная кансерваторыя імя А. В. Луначарскага;**
**Мінскі педагагічны інстытут замежных моў;**
**Беларускі політэхнічны інстытут;**
**Вярхоўны суд БССР;**
**Пракуратура БССР;**
**Міністэрства ўнутраных спраў БССР;**
**Кіеўскі дзяржаўны універсітэт імя Т. Шаўчэнкі;**
**Беларускае аб'яднанне па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў;**
**Цэнтральны навукова-даследчы інстытут тэхнікі кіравання;**
**Фізіка-тэхнічны інстытут АН БССР;**
**Навукова-даследчы інстытут бульбаводства і гароднінаводства;**
**Інстытут фізіка-арганічнай хіміі АН БССР;**
**Мінскі АК ЛКСМБ;**
**Навукова-даследчы інстытут электронна-вылічальных машын;**
**Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава;**
**Мінскі інстытут культуры;**
**Мінскі трактарны завод імя У. І. Леніна;**
**Інстытут механікі металапалімерных сістэм АН БССР;**
**Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР;**
**Дзяржкамітэт па тэлебачанню і радыёвяшчанню БССР;**
**Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава;**
**Прэзідыум Мінскага абласнога камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў;**
**Латвійскі дзяржаўны універсітэт імя П. Стучкі;**
**Сакратарыят Саюза пісьменнікаў БССР;**
**Інстытут фотабіялогіі АН БССР;**
**Міністэрства юстыцыі БССР;**
**Мінскі ГК ЛКСМБ;**
**Генеральнае консульства ГДР у Мінску;**
**Інстытут эксперыментальнай батанікі АН БССР;**
**Гродзенскі дзяржаўны універсітэт;**
**Акадэмія навук БССР;**
**Вільнюскі дзяржаўны універсітэт;**
**Міністэрста вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР;**
**Міністэрства асветы БССР;**
**Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава;**
**Інстытут ядзернай энергетыкі АН БССР;**
**Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры;**
**Камітэт па фізічнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў БССР.**
**Інстытут генетыкі і цыталогіі АН БССР;**
**Гомельскі політэхнічны інстытут;**
**Вытворчае аб'яднанне «Гарызонт»;**
**ЦК ЛКСМБ;**
**Вытворчае аб'яднанне «Інтэграл»;**
**Інстытут цепла- і масаабмену АН БССР;**
**Гомельскі дзяржаўны універсітэт;**
**Ташкенцкі дзяржаўны універсітэт;**
**Прэзідыум Рэспубліканскага камітэта прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў.**

# Па-ленінску жыць працаваць і вучыцца

(Заканчэнне. Пачатак на 2—3-й стар.).

цы працягваюць працаваць над рашэннем праблем, звязаных з узросшымі задачамі сацыяльна - эканамічнага, палітычнага і духоўнага развіцця грамадства.

Вялікі слаўны шлях пройдзены Беларускім універсітэтам за 60 гадоў, цікавае і шматграннае жыццё яго калектыву сёння, грандыёзныя планы.

У адпаведнасці з рашэннямі XXVI з'езда КПСС пастаянна ўдасканальваецца якасць падрыхтоўкі выпускнікоў БДУ, паспяхова развіваюцца навуковыя даследаванні, больш цеснай і плённай становіцца сувязь з вытворчасцю, развіваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Мы будзем будаваць не толькі новыя вучэбныя і навукова - даследчыя карпусы, але і школу для таленавітых вучняў, спартыўныя комплексы, маладзёжны клуб, новыя інтэрнаты, жылыя дамы і многае іншае.

Гаворачы аб сённяшніх поспехах універсітэта, мы заўсёды павінны памятаць аб тых, хто стаяў ля яго калыскі, хто з году ў год памнажаў яго навукова-педагагічны аўтарытэт. Гэта — слаўная кагорта выдатных прафесараў, дацэнтаў, педагогаў, імёны якіх залатымі літарамі напісаны на першых старонках цудоўнага летапісу Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта, які носіць імя У. І. Леніна.

Будучае пачынаецца сёння. А наша сёння — гэта барацьба за выкананне гістарычных рашэнняў XXVI з'езда КПСС. Калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта поўны рашучасці памнажаць свой уклад у выкананне велічных планаў Камуністычнай партыі.

Аб вялікім значэнні БДУ ў развіцці навукі і культуры, аб брацкіх сувязях з суседнімі універсітэтамі, аб ролі яго ў стварэнні многіх мінскіх ВНУ і ў станаўленні Акадэміі навук БССР, Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна, многіх навукова-даследчых устаноў і прадпрыемстваў, а таксама аб сённяшнім дні флагмана беларускай вышэйшай школы гаварылі ў сваіх выступленнях прэзідэнт Акадэміі навук БССР, Герой Сацыялістычнай Працы акадэмік АН СССР М. А. Барысевіч, міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР прафесар М. М. Мяшкоў, прафесар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава Э. Д. Яршоў, рэктар Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя В. Капсукаса, акадэмік АН Літоўскай ССР, Герой Сацыялістычнай Працы І. П. Кубілюс, слесар вытворчага аб'яднання «Інтэграл», Герой Сацыялістычнай Працы У. У. Заблоцкі, рэктар Мінскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута прафесар А. А. Ключароў, студэнтка III курса філалагічнага факультэта Т. Баркун.

Пасля ўрачыстай часткі ўдзельнікі сходу былі запрошаны на святочны канцэрт. Неўміручая латынь старажытнага студэнцкага гімна абвясціла пачатак яго. На сцэне — зводны універсітэцкі хор.

І вось ужо змяняюць адзін аднаго салісты і славутыя універсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці — нібы дораць шаноўнаму юбіляру суквецці талентаў. Павольная мелодыя Ю. Семянякі змяняецца нястрымнай «Беларускай полькай» у апрацоўцы К. Паплаўскага. Іх выконвае народны аркестр народных інструментаў, лаўрэат Усесаюзнага фестывалю мастацкай самадзейнасці, дыпламант рэспубліканскіх аглядаў. Эстафету падхоплівае самабытны хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. Апладысментамі сустракаюць гледачы горача любімы «Крыжачок» — народны ансамбль танца, які быў неаднаразова лаўрэатам і дыпламантам усесаюзных і рэспубліканскіх конкурсаў мастацкай самадзейнасці, а таксама атрымаў званне лаўрэата Міжнароднай асацыяцыі універсітэтаў. Але найбольшы поспех, безумоўна, выпаў на долю ансамбля танца дзяцей выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ. Самы малодшы па ўзросту ўдзельнікаў і творчаму ўзросту дзіцячы калектыў «юбілейнай полькай», выкананай непасрэдна і па-майстэрску, крануў сэрцы ўсіх прысутных.

Яркія нацыянальныя беларускія, украінскія, рускія касцюмы танцораў, экзатычныя ўборы замежных студэнтаў, з густам афармленая сцэна, народная музыка, вершы паэтаў — выхаванцаў БДУ — усё гэта надавала універсітэцкаму святу непаўторны каларыт, адлюстроўвала еднасць культурнага жыцця народаў СССР і павагу да творчасці і звычак брацкіх народаў.

Праграма канцэрта, складзеная з пяці частак, кожная з якіх адпавядала тэмам «Люблю свой край, сваю Айчыну», «Жывая сувязь пакаленняў», «Мы за мір на ўсёй планеце», «У брацкай сям'і народаў», «Расці і слаўся год ад году, наш родны універсітэт», увабрала плён культурных здабыткаў шматнацыянальнай універсітэцкай сям'і. Па шырыні і разнастайнасці тэматыкі выступленняў, па мастацкаму майстэрству выканаўцаў, па колькасці ўдзельнікаў, якіх было звыш 700 чалавек, гэты канцэрт стаў фестывалем універсітэцкай самадзейнай творчасці, прысвечаным 60-годдзю роднага універсітэта.



**Наш кар.**
Фота **В. Шачака.**

# КАШТОЎНЫ ДАР

БЕЗ ПЕРАБОЛЬШАННЯ магу сказаць, што з Беларускім дзяржаўным універсітэтам звязана ўсё маё свядомае жыццё.

Я паступіў на фізіка-матэматычнае аддзяленне педагагічнага факультэта БДУ ў 1928 годзе і закончыў яго ў 1931 годзе. Прайшло паўстагоддзя з таго часу, як я пачаў сваю працоўную дзейнасць, атрымаўшы падрыхтоўку ў сценах універсітэта.

Усе ведаюць, што зараз студэнты навучаюцца пяць гадоў, а па некаторых спецыяльнасцях — нават болей. Аднак у тыя далёкія гады, калі наша краіна, у тым ліку і Беларусь, пераадольвалі цяжкую спадчыну мінулага, быў абвешчаны лозунг: веды — народу. Патрэбны былі кадры выкладчыкаў для школ, якія паўсюдна адкрываліся. Вось чаму тэрмін навучання ў БДУ быў часова скарочаны тады да трох гадоў.

Гады майго навучання супалі з інтэнсіўным будаўніцтвам Універсітэцкага гарадка, і прыкладна за год да заканчэння мы праводзілі ўжо частку заняткаў у новым вялікім і добраўпарадкаваным галоўным корпусе (цяпер у ім размяшчаецца Мінскі педагагічны інстытут).

У 1936 годзе пасля заканчэння аспірантуры пры Ленінградскім універсітэце і абароны дысертацыі я вярнуўся ў БДУ —першы кандыдат навук у рэспубліцы — і пачаў працаваць на фізмаце ў якасці дацэнта. З 1938 года ўзначаліў кафедру тэарэтычнай фізікі. У 1943 годзе стаў дэканам фізіка-матэматычнага факультэта, чвэрць века быў загадчыкам кафедры тэарэтычнай фізікі. Я даўно перайшоў на работу ў Акадэмію навук БССР, але і па сённяшні дзень чытаю лекцыі, кірую дыпломнікамі і аспірантамі.

І да таго часу, пакуль у мяне хопіць сіл, я буду рабіць гэта, таму што лічу сябе вечным даўжніком нашага роднага універсітэта, першай ВНУ рэспублікі, у сценах якой у далёкія гады свайго юнацтва я атрымаў тое, чаму няма цаны —веды.

**Ф. ФЁДАРАЎ,**
**акадэмік-сакратар аддзялення фізіка-матэматычных навук АН БССР,**
**Герой Сацыялістычнай Працы.**

**УНІВЕРСІТЭТ У ІХ ЛЁСЕ**

# ЯК МОЙ ДОМ

МОЙ УНІВЕРСІТЭТ! Мой геафак. Калі я вымаўляю гэтыя словы, яны гучаць для мяне як родны дом, Радзіма. Больш за сорак гадоў майго жыцця звязана з імі.

Увосень, у пачатку новага навучальнага года, я гляджу на чырвоныя клёны ля ўваходу ў галоўны корпус, думаю аб тым, як многа яны бачылі, і, нахіляючыся, паднімаю з зямлі стракатае лісце — як памяць аб тых, каго ўжо няма.

У даваенныя гады мы—студэнты геаграфічнага факультэта — з цікавасцю вучыліся, спрачаліся, даведваліся аб новым. Мы ўмелі радавацца жыццю. І толькі тады па-сапраўднаму зразумелі, які дарагі для нас родны універсітэт, калі развіталіся з ім у горкія і страшныя гады вайны. Мы і нашы равеснікі, хлопцы і дзяўчаты, раптоўна сталі дарослымі людзьмі, на плечы якіх лёг свяшчэнны клопат аб перамозе на фронце і ў тыле.

У верасні 1943 года, калі на станцыі Сходня пад Масквой пачаў працаваць Беларускі універсітэт, сабраўся невялікі атрад студэнтаў і выкладчыкаў з розных куткоў краіны. З шасцідзесяці студэнтаў нашага трэцяга курса было толькі сем. Нягледзячы на цяжкасці ваеннага часу, працавалі і вучыліся мы ўпарта, тым больш, што Савецкая Армія пачала свой пераможны паход на захад. А потым была ні з чым не параўнальная радасць вызвалення роднага Мінска, сустрэча з універсітэтам, праўдзівей, з тым, што ад яго засталося.

Студэнтыператварыліся ў грузчыкаў і будаўнікоў: мы навучыліся цягаць цэглу і цяжкія аконныя шыбы з развалін, бетаніраваць перакрыцці аднаўляемага корпуса, спакойна адносіцца да грозных надпісаў сапёраў: «Асцярожна, міны!», пісаць у пальчатках канспекты, жыць зімой у нятопленых пакоях, бачыць і цаніць кожную, хоць маленькую, працоўную перамогу.

Я вырасла на геаграфічным факультэце. Цудоўныя спецыялісты — мае настаўнікі і калегі— стварылі яго. Гэта І. С. Лупіновіч, В. А. Дзяменцьеў, А. Х. Шкляр, У. Г. Заўрыеў, А. Г. Мядзведзеў, А. Я. Малышаў, М. Т. Раманоўскі, І. І. Трухан, В. А. Жучкевіч і іншыя.

Ад імя ўсіх выпускнікоў я хацела б сказаць сённяшнім студэнтам: «Беражыце свой родны універсітэт, не забывайцеся, што вы, яго выхаванцы, абавязаны несці веды маладым пакаленням».

**В. ЯКУШКА,**
**доктар геаграфічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі БССР.**

# ВЕТЭРАНЫ Ў СТРАІ

БОЛЬШ ЗА 40 ГАДОЎ прайшло з той пары, як мне, беларускаму юнаку, пашчасціла пераступіць прыступку першай у рэспубліцы вышэйшай навучальнай установы. І зараз з вялікай павагай і падзякай я ўспамінаю імёны тых, хто, не шкадуючы сіл і часу, навучаў і выхоўваў нас: рэктара універсітэта П. П. Савіцкага, выкладчыкаў В. Н. Перцава, І. В. Гутарава... Яны служылі для нас маральным узорам, прыкладам сумленнасці, дабраты, пастаянна клапаціліся аб тым, каб выхаваць з нас людзей шырока адукаваных, якія творча думаюць, прывівалі нам нястомную прагу ведаў.

Асаблівая ўвага ў перадваенныя гады ўдзялялася ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнцкай моладзі, падрыхтоўцы яе да абароны заваёў Кастрычніка.

Мірная праца савецкіх людзей, напружаныя дні экзаменацыйнай сесіі перапыніла вайна.

У першыя дні суровых выпрабаванняў 245 студэнтаў і выкладчыкаў БДУ пайшлі ў дзеючую армію. Многія з іх абаранялі Маскву і Ленінград, змагаліся з ворагам пад Сталінградам і на Курскай дузе, вызвалялі Украіну, Беларусь, Літву, Латвію, Эстонію, Малдавію, Польшчу, удзельнічалі ў баях за Берлін і Прагу. Сярод іх быў камуніст Іван Рыбакоў, які загінуў у баі ў верасні 1943 года, член камсамольскага камітэта універсітэта Леанід Сокал, які аддаў сваё жыццё за перамогу над ворагам, абараняючы Маскву. Актыўна ўдзельнічалі ў баях з ворагам аспіранты і студэнты універсітэта К. К. Герман, У. С. Грыгор'еў, Ф. Г. Кітуновіч, А. І. Ляўко, І. А. Прусаў, П. З. Савачкін, А. І. Сідарэнка, Г. М. Трухноў і многія іншыя.

Мужна змагаліся з гітлераўскімі захопнікамі ў саставе партызанскіх фарміраванняў і ў падполлі І. В. Гутараў, С. Х. Александровіч, І. Р. Некрашэвіч, М. Т. Раманоўскі, М. Я. Рэзнікаў і многія іншыя.

Усе свае сілы і веды аддавалі справе разгрому ворага выкладчыкі і студэнты універсітэта, якія змаглі эвакуіравацца ў першыя дні вайны ў тыл.

А ледзь адгрымелі залпы вайны, у гімнасцёрках і салдацкіх шынялях студэнты вярнуліся ў аўдыторыі, каб закончыць адукацыю. З 1337 студэнтаў універсітэта, якія навучаліся ў даваенным 1940—1941 навучальным годзе, да вучобы прыступіла невялікая колькасць тых, хто застаўся ў жывых. Але яны склалі касцяк студэнцкага калектыву.

У БДУ імя У. І. Леніна зараз працуюць каля 350 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Усе яны актыўна ўдзельнічаюць у грамадска-палітычнай рабоце, з'яўляюцца актыўнымі прапагандыстамі гераічных рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый Камуністычнай партыі і савецкага народа не толькі сярод студэнцкай моладзі, але і сярод працоўных рэспублікі.

Ветэраны актыўна ўдзельнічаюць у правядзенні абаронна-масавай работы, аказваюць вялікую дапамогу камсамольскім і прафсаюзным арганізацыям у ваенна-патрыятычным выхаванні студэнтаў, ва ўмацаванні шэфскіх сувязей універсітэта з воінамі доблесных Савецкіх Узброеных Сіл, якія пільна стаяць на варце мірнай працы савецкага народа, яны разам з усім калектывам універсітэта напружана працуюць па выхаванню ў студэнцкай моладзі бязмежнай адданасці Камуністычнай партыі, гатоўнасці ў любую мінуту стаць на абарону заваёў сацыялізму.

**І. МАРЧАНКА,**
**старшыня савета ветэранаў вайны універсітэта.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

21 студзеня 1982 г.

Заказ 114. АТ 03023

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ